УДК 930 (476)+357.71

**Шаўчук І.І., Карзенка Г.У.***

# СТВАРЭННЕ ІНСТЫТУТА БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ: ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫЯ АКЦЭНТЫ

Інстытут беларускай культуры не ігнараваўся і даваеннай гістарыяграфіяй, і пасляваеннай да 1970-х гадоў, калі яму сталі прысвячацца спецыяльныя публікацыі. Як правіла, з 1930-х гадоў увага ўстанове надавалася не ў спецыяльных, а ў абагульняльных працах, манаграфіях і брашурах па іншай гістарычнай праблематыцы. Аўтарскія працы неаднолькавыя і па колькасці фактычнага матэрыялу, а значыць, па глыбіні аналізу гісторыі ІБК, і, зразумела, па зробленых высновах. У значнай ступені сказанае з'явілася адлюстраваннем не толькі ўплыву палітычнай сітуацыі на асвятленне пытання. Галоўным чынам гэта абумоўлівалася задачамі, пастаўленымі аўтарамі перад сабой. Нехта зрабіў Інбелкульт прадметам спецыяльнага даследавання, а нехта атачыў установу шырэйшым гістарычным кантэкстам з мэтай вырашэння іншых навуковых задач.

Пры аналізе ўзнятага пытання трэба спыніцца яшчэ і на тэрміналагічным аспекце. Напрыклад, такія словы, як "адчынены", "адкрыты", "заснаваны" не нясуць канкрэтнай сэнсавай нагрузкі (далей дадзеныя вызначэнні будуць разумецца як "створаны"). Таму, думаецца, больш адпаведнай будзе пастаноўка пытання іншым чынам: "час стварэння" і "час пачатку дзейнасці". Трэба мець на ўвазе, што пры высвятленні часу стварэння і пачатку дзейнасці патрабуюць раскрыцця і такія пытанні, як база, на якой узнік Інбелкульт, яго кадравы склад (патэнцыял), юрыдычныя падставы функцыянавання.

Што тычыцца часу стварэння ІБК, то ў пераважнай колькасці публікацый дамінуе вядомая схема: Інбелкульт створаны на базе Навукова-тэрміналагічнай камісіі (Навуковая камісія па складанні і апрацоўцы беларускай тэрміналогіі, НТК) і ІБК створаны (заснаваны, адчынены, адкрыты, запачаткаваны) 30 студзеня 1922 г. Паказальным фактам ёсць матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 90-годдзю Інстытута беларускай культуры [9]. У зборніку змешчана 18 артыкулаў, дзе закранаецца праблема стварэння ўстановы. Дванаццаць з іх утрымліваюць акрэсленую вышэй схему. З адрозных пазіцый выступілі толькі шэсць вучоных, то бок траціна. Але гэтую сітуацыю можна разглядаць як пэўны прагрэс, паколькі яна сведчыць пра сталы інтарэс да пачатковага перыяду інстытуалізацыі акадэмічнай навукі Беларусі. Падобнага кшталту меркаванні не гучалі на працягу звыш 80 гадоў пасля публікацый У.М. Ігнатоўскага [10; 11].

Ад пачатку звернем увагу на папулярызацыю Інбелкульта і калектыўныя абагульняльныя працы па гісторыі Беларусі. На апошнія звяртаецца ўвага таму,

---

* *Шаўчук Ігар Іванавіч* – прафесар кафедры гісторыі славянскіх народаў гістарычнага факультэта БрДУ, доктар гістарычных навук, дацэнт; ***Карзенка Георгій Уладзіміравіч*** – прафесар кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін БДПУ, доктар гістарычных навук, прафесар.

што адпаведныя тэксты ў іх выкананыя, як правіла, тымі навукоўцамі, што прафесійна даследавалі акрэсленыя пытанні.

Цяпер у ха占налагічным парадку разгледзім пазіцыі калектыўных прац па пытанні часу стварэння ІБК. Пяцітомная “Гісторыя Беларускай ССР” канстатуе: “Ён (ІБК. – *І. Ш., Г. К.*) быў адкрыты 20 лютага 1922 г. на базе Навукова-тэрміналагічнай камісіі, якая існавала з лютага 1921 г. і займалася *галоўным чынам* (тут і далей выдзяленне наша. – *І. Ш., Г. К.*) выпрацоўкай беларускай навуковай тэрміналогіі” [4, с. 322]. Праз 22 гады – “Нарысы гісторыі Беларусі”: “На базе гэтай камісіі (НТК – *І. Ш., Г. К.*) 30 студзеня быў заснаваны Інстытут беларускай культуры” [25, с. 135]. У 2006 г. гэтая ж дата фіксуецца і 6-томнай “Гісторыяй Беларусі”: “...на яе (НТК. – *І. Ш., Г. К.*) аснове пачаў сваю дзейнасць Інстытут беларускай культуры” [3, с. 233].

Трэба мець на ўвазе, што спецыяльную распрацоўку гісторыі Інбелкульта ў пасляваенны час можна адлічваць з 1970-х гадоў. Першай такой публікацыяй стаў артыкул У.А. Палуяна. Ён лічыў, што Інбелкульт створаны на базе НТК на пачатку 1922 г., адкрыццё якога адбылася 20 лютага [27, с. 104]. Аналагічную пазіцыю папярэдне прадэманстраваў і эмігранцкі беларускі даследчык І. Няміга: “Пераймаючы спадчыну ад Навукова-тэрміналагічнай камісіі... у лютым 1922 г., Інбелкульт яшчэ не меў свайго статуту...” [26, с. 18]. У тым жа годзе, як і У.А. Палуян, У.У. Грамовіч у энцыклапедычным артыкуле прадставіў канкрэтную дату стварэння ўстановы – 30 студзеня [5, с. 110]. Іншае меркаванне праз сем гадоў выказаў У.М. Міхнюк: ІБК адкрыты 1 лютага [18, с. 21]. Што цікава, у доктарскай манаграфіі аўтара нічога не гаворыцца пра час стварэння ІБК [16], хаця пазней разам з суаўтарамі [6] і без [17] Уладзімір Мікалаевіч схіляўся да 30 студзеня як даты заснавання Інстытута.

Паглядзім, як папулярызуецца гісторыя Інбелкульта. Напрыклад, Радые Свабода ў 2005 г. паведаміла: “29 студзеня 1922 года ў Менску быў створаны Інстытут беларускай культуры, які пазней рэарганізуюць у Акадэмію навук” [1]. Вікіпедыя паведамляе: “Інстытут быў заснаваны 30 студзеня 1922 у Мінску на базе Навукова-тэрміналагічнай камісіі Наркамасветы БССР” [8; 13]. У сваю чаргу, А.Ф. Мяснікоў сцвярджаў: “І зусім невыпадкова 20 сакавіка 1922 года Савет Народных Камісараў БССР на базе навукова-тэрміналагічнай камісіі стварае Інстытут беларускай культуры”. Апошняй інфармацыі рацыянальнага тлумачэння я не знаходжу. Але першая і другая досыць зразумелыя, паколькі 28–30 студзеня мела месца першае пасяджэнне ІБК. Дарэчы, у адным з варыянтаў справаздачы ІБК за 1922 г. гаворыцца, што “ІБК арганізаваны *28–30 студзеня* 1922 г.” [21, арк. 1]. Так што сучасныя аўтары маюць пэўныя падставы для сцвярджэння пра 30 студзеня як даты “заснавання, стварэння” і г.д. Інбелкульта. Але адпаведна ўзнікае пытанне: “Чаму тады не 28 ці 29 чысло або 28–30?”. Згадаем, што ў калектыўнай манаграфіі “Інстытут беларускай культуры” памылкова сцвярджаецца, што першы “агульны сход супрацоўнікаў Інстытута беларускай культуры... адбыўся *30 студзеня* 1922 г.” [13, с. 9].

Такім чынам, сёння практычна не згадваецца раней папулярная дата 20 лютага. І гэта справядліва, паколькі ніякай ролі ў гісторыі ўстановы яна не

адыграла. Яшчэ ў 1992 г. П.Ц. Петрыкаў прыводзіў у артыкуле вытрымку з архіўнага дакумента, дзе канстатавалася, што "создана комиссия по устройству торжественного заседания *по поводу открытия деятельности* Инбелкульта. Открытие имеет быть 20-го февраля с.г." [28, с. 56; 20, арк. 27]. У дадзеным выпадку дакумент наўмысна цытуецца на мове арыгінала з тым, каб не было рознанычытанняў. Выдзеленыя словы павінны звярнуць увагу на тое, што урачыстасці арганізоўваліся не з нагоды "*адкрыцця*" ці "*стварэння*" ІБК, а з нагоды *пачатку дзейнасці* ўстановы. Невялікае значэнне, якое надавалася кіраўніцтвам рэспублікі і Наркамасветы гэтаму мерапрыемству пацвярджае сведчанне У.М. Ігнатоўскага: "...урачыстасць адчынення Інбелкульту была прызначана на 20 лютага 1922 году. Урачыстае адчыненне за выездам Наркома Асветы і іншых адказных працаўнікоў у Маскву і на паветы, так і не адбылося. Гэты факт будзе для нас зусім зразумелым, калі мы ўспомнім, што Компартыя, Савецкая ўлада і ўвесь саюз ССР перажывалі ў гэты момант цяжкія часы голаду. Трэба было напружыць усе сілы, каб змагацца за жыцце мільёнаў галадуючых. Было не да ўрачыстасцяў... Інбелкульт, гэтае дзіця Компартыі і Савецкай улады, перажываў трывогі і беды ўсёй савецкай краіны. Забыўшыся аб урачыстым адчыненні, ён прыступіў зноў да штодзённай чорнай працы над адраджэннем беларускай культуры" [11, с. 11–12].

Сённяшнія даследчыкі ў сваёй большасці выкарыстоўваюць "кананічную" інфармацыю, прадстаўленую ў 1979 г. фундаментальным выданнем "Академия наук Белорусской ССР": "30 студзеня 1922 г. на базе Навукова-тэрміналагічнай камісіі заснаваная першая шматгаліновая навукова-даследчая ўстанова рэспублікі – Інстытут беларускай культуры" (аўтар раздзела М.І. Галенчык) [2, с. 14]. Як бачна, падводзячы вынікі папярэднім даследаванням, калектыўная манаграфія замацавала паказаныя на пачатку артыкула схему і час стварэння Інбелкульта (У.У. Грамовіч), што было пацверджана спецыяльным выданнем, дзе сфармуляваныя пазіцыі 1970-х гадоў [12, с. 9].

У дадзеным выпадку звяртае на сябе ўвагу, што ўсе аўтары, дэманструючы ўласныя погляды на дату стварэння ІБК, не прадстаўляць ніякай аргументацыі на карысць сваіх канстатацый. Час стварэння ўстановы ў розных варыянтах згадваецца як апрыёрна вядомы, які не патрабуе доказаў.

Выключэннем стаў грунтоўны артыкул П.Ц. Петрыкава. У ім вучоны цытуе архіўны дакумент пра *чарговую* рэарганізацыю структуры Акадэмцэнтра 1 лютага 1922 г., але на "чарговасць" увага не звяртаецца. У яе выніку АЦ складаўся з шасці інстытуцый: ІБК, Навукова-літаратурная калегія, Белдзяржмузей, Беларускі архіў, Яўрэйская гістарычная камісія, Белдзяржбібліятэка. На гэтай падставе робіцца выснова: "Мы бачым, што са *з'яўленнем* Інбелкульта «зніклі» тры быўшыя раней самастойнымі навуковыя камісіі АЦ – тэрміналагічная, педагагічная, рэдакцыйная... апошнія дзве камісіі былі невялікія, да таго ж некаторыя іх члены працавалі і ў Тэрміналагічнай камісіі, то ў хуткім часе ў афіцыйных дакументах, а потым і ў літаратуры з'явіўся вывад, што «ІБК арганізаваўся з Навукова-тэрміналагічнай камісіі 30 студзеня 1922 г.»" [28, с. 57].

Прыведзенае меркаванне выклікае некалькі пытанняў. Па-першае, аўтар сцвярджае пра “*з'яўленне*” Інстытута беларускай культуры ў канцы студзеня 1922 г. Гэта пры тым, што ў артыкуле папярэдне неаднаразова згадвалася “з’яўленне” ўстановы ў 1921 г. і падкрэслівалася дата *стварэння* – 30 студзеня 1922 г. Па-другое, паколькі не выяўлена іншых канкрэтных сведчанняў, можна з тым жа поспехам дапусціць, што функцыі рэдакцыйнай камісіі перайшлі да Навукова-літаратурнай калегіі, а педагагічная камісія рэарганізаваная ў Педагагічнае таварыства, якое сустракаецца ў дакументах пазней [напр.: 29, арк. 4]. Магчыма, функцыі камісіі таксама перайшлі да Навукова-літаратурнай калегіі, паколькі педагагічная камісія за тры месяцы існавання (з сярэдзіны верасня) распрацавала і надрукавала 10 праграм для школ, займаючыся менавіта праграмным і метадычным забеспячэннем іх дзейнасці. Па-трэцяе, на с. 54 аўтар згадвае структуру АЦ, у якой на кастрычнік 1921 г. налічваў 17 падраздзяленняў, у т.л. НТК і Інстытут беларускай і яўрэйскай культуры.

Разам з тым П.Ц. Петрыкаў не зусім уважліва разгледзеў даныя “Справаздачы пра дзейнасць Акадэмічнага Цэнтра Наркамасветы Беларусі за 1921-ы год”, складзенай 12 студзеня 1922 г. У ёй змешчаныя вынікі працы 16 ўстаноў, хаця на самой справе іх пранумаравана 17. Прычына гэтага прадстаўлена ў тэксце справаздачы: “3. Навукова-літаратурная і 4. Навукова-рэдакцыйная камісіі, што стала працягам дзейнасці папярэдняй...” [23, арк. 36]. Адначасова там фіксуецца прысутнасць 19 “інстытуцый” у складзе АЦ за ўвесь перыяд яго існавання з канца чэрвеня. Вынікае, у артыкуле П.Ц. Петрыкава прысутнічаюць пэўныя недакладнасці: па-першае, даныя справаздачы за 1921 г. ён экстрапалюе на пачатак наступнага; па-другое, памылковым ёсць сцвярджэнне даследчыка пра адначасовае існаванне літаратурнай і рэдакцыйнай камісій.

На думку П.Ц. Петрыкава, існавалі тры варыянты арганізацыі ІБК: як новая структура НКА; на базе навуковых інстытуцый, што існавалі; як Інстытут беларускай і яўрэйскай культуры (ІБіЯК). На першым варыянце спыняцца няма сэнсу, паколькі тут аўтар відавочна памыляецца, да таго няўдала фармулюе думку стылістычна, таму што ў любым выпадку ІБК ствараўся як новая структурная адзінка (установа, “інстытуцыя”) Наркамасветы. Другі варыянт таксама выклікае шэраг пытанняў. Першая згадка пра *фактычнае існаванне* ІБК адносіцца да 1 верасня 1921 г. Разам з Інбелкультам мінімум да сярэдзіны студзеня 1922 г. падчас перыядычных рэарганізацый Акадэмцэнтра існуюць НТК, педагагічная і да 1 лютага – рэдакцыйная камісіі. Такім чынам, праблематычна сцвярджаць пра стварэнне ІБК на базе згаданых “інстытуцый”.

Безумоўна, прыведзеныя даныя можна падагнаць пад схему, што стала прапісалася ў гістарыяграфіі. Гэтаксама, калі не аналізаваць сукупнасць наяўных матэрыялаў, на карысць такой “падгонкі” паслужыць і персанальны склад НТК і ІБК. Насамрэч персанальныя змены ў складзе працаўнікоў НТК і першага штата ІБК нязначныя – каля 30 %. Ці ёсць падставы, зыходзячы з гэтага, для

прыведзеных вышэй канстатацый нра стварэнне ІБК на базе НТК? Сумніўна. Наша пазіцыя грунтуецца на шэрагу фактараў.

Першае, усе аўтары падкрэсліваюць недастатковую колькасць кваліфікаваных навукоўцаў і сродкаў для будаўніцтва не толькі вышэйшай школы, але і асобнага навукова-даследчага комплексу акадэмічнага кшталту. Другое, беларускія дзеячы на дадзеным этапе імкнуліся стварыць менавіта беларускую навукова-грамадскую (навукова-культурную) ўстанову. Трэцяе, таму для іх быў непрымальны варыянт навукова-даследчага інстытута пры БДУ, прапанаваны У.І. Пічэтам па прыкладзе Інстытута гісторыі ФГН Маскоўскага дзяржуніверсітэта, штатным праўдзейным членам і часовым членам Прэзідыума якога, ен з'яўляўся [14, с. 41]. Гэта вынікае з таго, што сярод прафесарска-выкладчыцкага складу БДУ пераважалі рускія і яўрэі: у 1921/22 навучальным годзе – амаль 70 % (беларусы – амаль 22 %) [24, арк. 1].

Нарэшце пра трэці, паводле П.Ц. Петрыкава, варыянт стварэння ІБК як супольнага Інстытута беларускай і яўрэйскай культуры. Аўтар сцвярджае: "...*яўрэйскія колы ставілі пытанне* аб утварэнні самастойнага Інстытута яўрэйскай культуры. Не стаялі ў баку і *прадстаўнікі польскай інтэлігенцыі*. Але магчымасці, перш за ўсе матэрыяльна-фінансавыя, не дазвалялі стварыць адразу два ці тры інстытуты такога профілю" [28, с. 55]. Услед за ім тое самае канстатаваў М.У. Токараў [32, с. 133]. У гэтай сувязі трэба адзначыць, што ў ніводнай публікацыі пачатку 1920-х гадоў і ў ніводным архіўным дакуменце, на якія спасылаюцца згаданыя даследчыкі, асабліва П.Ц. Петрыкаў, няма ніякіх згадак пра актыўнасць у дадзеным накірунку "польскай інтэлігенцыі" альбо пра пастаноўку пытання падобным чынам "яўрэйскімі коламі".

Сітуацыя была якраз адваротная той, што прадстаўлена вучонымі. Для пацверджання сваей думкі пра яўрэйскую навуковую работу прывяду вытрымкі са снежаньскай (1921 г.) запіскі намесніка старшыні АЦ С.М. Некрашэвіча наркаму асветы У.М. Ігнатоўскаму з адказам на скаргу яўрэйскага бюро НКА* пра ігнараванне пытанняў яўрэйскага культурнага жыцця: "Гэтая культурна-навуковая праца магла выяўляцца ў двух напрамках – у стварэнні Яўрэйскага акадэмічнага тэатра і Інстытута яўрэйскай культуры. Першае пытанне ажыццёўлена, толькі [не з] ініцыятывы т. Франкфурта... Што ж тычыцца другога пытання – стварэння Інстытута яўкультуры, то да гэтага пытання Яўбюро паставілася цалкам індыферэнтна, а між тым ініцыятыва па арганізацыі гэтай установы, як спецыяльна-яўрэйскай, можа зыходзіць толькі ад Яўбюро. Акадэмічным Цэнтрам з свайго боку былі прадстаўлены ўсе магчымасці: 1) заснавана была спецыяльная пасада па распрацоўцы пытання аб Інстытуце яўкультуры; 2) у заяўцы ад 31 кастрычніка г[этага]. г[ода]... зроблены запыт на 30 пайкоў для названай ўстановы" [23, арк. 28 адв.].

Таму не зусім пераканаўчым выглядае сцвярджэнне П.Ц. Петрыкава аб канчатковым вырашэнні пытання пра *стварэнне асобнага* ІБК толькі 24 студзеня 1922 г. на "прэзідыуме Цэнтральнага Бюро КП(б)Б". Адначасова нельга не

---

* Цэнтральнае яўрэйскае бюро Наркамата асветы ССРБ [33].

пагадзіцца з высновай вучонага, што "арганізацыя Інстытута беларускай культуры – гэта не аднаразовы акт, а працэс, які ўключае ў сябе прапановы-ідэі, падрыхтоўчы этап для іх рэалізацыі і факт узнікнення такой установы" [28, с. 56].

Арыентуючыся на прапанаваныя П.Ц. Петрыкавым тры этапы, паспрабуем акрэсліць іх. *Прапановы-ідэі.* Характарызуючы першы этап, дакладней было б казаць пра "ідэі" і яго заканчэнне можна аднесці да студзеня 1921 г., калі адбыўся сход беларускай грамадскасці, на якім С.М. Некрашэвіч выступіў з прапановай арганізацыі лабараторыі для беларускага Адраджэння. Дадзеная інфармацыя пацвярджаецца актыўнымі ўдзельнікамі тых падзей: З.Ф. Жылуновічам [7, с. 92], С.М. Некрашэвічам [31, с. 279], Я.П. Каранеўскім [15, с. 16], У.М. Ігнатоўскім.

Пачатак *падрыхтоўчага этапу* можна аднесці да лютаўскай (1921 г.) пастановы Прэзідыума ЦВК БССР пра стварэнне БДУ. У ёй трэцім пунктам патрабавалася: "Пры БДУ заснаваць навукова-даследчы Інстытут беларускай і яўрэйскай культуры" [30, с. 116]. Тое ж паўторана красавіцкай (1921 г.) пастановай III сесіі ЦВК БССР [29, с. 43]. Універсітэт 1 лістапада пачаў сваю дзейнасць без Інстытута беларускай і яўрэйскай культуры.

Наяўныя матэрыялы дазваляюць вызначыць *факт узнікнення,* дакладней *існавання*, Інстытута беларускай культуры на пачатку восені. Так, "Звесткі аб дзейнасці ўстаноў Наркамасветы на 01.09.21 г." на пытанне аб наяўнасці навуковых устаноў адказваюць: "1. Інстытут беларускай культуры (арганізуецца)... 5. Беларуская тэрміналагічная камісія (выпрацоўвае навуковыя тэрміны на беларускай мове)" [20, арк. 4 адв.]. Гэта першыя выяўленыя звесткі пра рэальны працэс стварэння ўстановы. Тут ёсць сэнс прывесці вядомую інфармацыю, не аднойчы выкарыстаную І.І. Шаўчуком і П.Ц. Петрыкавым. Аднак апошні аўтар разглядае яе як доказ неіснавання ІБК, паколькі ім прынятая пад увагу толькі частка з усяго комплексу даных: "З 1 кастрычніка 1921 г. у структуру Акадэмічнага цэнтра была ўведзеная штатная адзінка вучонага сакратара, на якую быў прызначаны С.С. Шпакаў. У яго абавязкі ўваходзіла падрыхтоўчая работа да адкрыцця такога інстытута (ІБК. – *І. Ш., Г. К.*)" [28, с. 54]. Але ў вядомай П.Ц. Петрыкаву справаздачы АЦ за 1921 г. зафіксавана наступнае: "Інстытут беларускай культуры *зрабіў падрыхтоўчую працу* да арганізацыі ўсіх беларускіх навуковых інстытуцый у адзін навукова-даследчы інстытут Б[еларускай]. К[ультуры]." [23, арк. 39]. Варта звярнуць увагу на словы "*зрабіў падрыхтоўчую працу*". Такім чынам, калі пайсці ўслед за папярэднімі даследчыкамі, вынікае, што Інбелкульт не існуе, але выконвае нейкія рэальныя функцыі. Гэта відавочны нонсэнс. Значыць, можна дапусціць, што фактычнае існаванне Інстытута пачалося калі не з 1 верасня, то з 1 кастрычніка 1921 г. з прызначэннем на штатную пасаду [вучонага] сакратара С.С. Шпакава [28, с. 55].

П.Ц. Петрыкава, па ўсёй бачнасці, бянтэжыць малалікасць штату ІБК у 1921 г., што служыць яму асновай доказу неіснавання ўстановы. Але, памятаючы пра татальны дэфіцыт кваліфікаваных кадраў, гэта не павінна здзіўляць. Напрыклад, ніхто не ставіць пад сумненне існаванне Тэатральнай

камісіі Акадэмцэнтра, якая мела ў сваім складзе толькі аднаго штатнага [вучонага] сакратара У.Я. Галубка, альбо яўрэйскай гістарычнай камісіі з адным штатным супрацоўнікам.

Рабіць ці шукаць нейкіх схем пры заснаванні розных навуковых і вучэбных інстытуцый у Беларусі надарэмна. Аргументуем думку наступнымі прыкладамі. Статут Навукова-тэрміналагічнай камісіі зацверджаны 10 лютага, матэматычная секцыя пачала працу 20 лютага, гуманітарная – 22 лютага, прыродазнаўчая – 24 лютага [23, арк. 14, 17, 17 адв.]. Акадэмічны цэнтр створаны 27 чэрвеня 1921 г. [22, арк. 4], а загад пра яго аддаецца толькі 11 ліпеня на ўрачыстым пасяджэнні з нагоды вызвалення Мінска ад палякаў у 1920 г. Дарэчы, тамсама У.М. Ігнатоўскі абвясціў дэкрэт урада пра "адчыненне на Беларусі ўніверсітэта". Што тычыцца БДУ, то агульнавядома, што ў чэрвені адкрыты рабочы факультэт (толькі з восені пачаў нармальна функцыянаваць [29, с. 46, 48]), 30 кастрычніка адбыўся урачысты сход, а рэгулярныя заняткі пачаліся з 1 лістапада. Такім чынам, да часу стварэння БДУ можна аднесці: лютаўская і красавіцкая пастановы ЦВК пра адкрыццё ўніверсітэта (згадваю рашэнні толькі 1921 г.), чэрвень (адкрыццё рабфака), 11 ліпеня (дэкрэт аб адкрыцці), 30 кастрычніка (урачыстае пасяджэнне), 1 лістапада (пачатак заняткаў. Любая з іх падыходзіць пад час стварэння ВНУ.

Усе пералічаныя калізіі не здзіўляюць даследчыкаў. Толькі калі размова тычыцца Інбелкульта, настойліва не заўважаецца, што з верасня Інстытутам вялася праца па арганізацыі яго функцыянавання, што ў лістападзе выпрацаваны статут. Пры гэтым упарта падкрэсліваецца стварэнне, заснаванне ўстановы 30 студзеня ці 20 лютага. Беручы пад увагу паказанае, ёсць падставы да трох вылучаных П.Ц. Петрыкавым перыядаў у гісторыі ІБК дадаць яшчэ адзін: *пачатак дзейнасці*, які можна аднесці да 28 (28–30) студзеня 1921 г., суаднёсшы яго з шырокавядомым першым агульным сходам супрацоўнікаў. Відавочна, што акрэсленая праблема заслугоўвае далейшага спецыяльнага даследавання.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ І КРЫНІЦ

1. 29 студзеня 1922 году ў Менску быў створаны Інстытут беларускай культуры [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.svaboda.org/content/article/791813.html. – Дата доступу: 02.02.2012.

2. Академия наук Белорусской ССР / Н. И Голенчик [и др] ; редкол.: Н. А. Борисевич (пред.) [и др.]. – Минск : Гл. ред. Белорус. Совет. Энцикл., 1979. – 600 с.

3. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2006. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2006. – 613 с.

4. Гісторыя БССР : у 5 т. / гал. рэдкал.: І. М. Ігнаценка (старшыня) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972–1975. – Т. 3 : Перамога Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і пабудова сацыялізму ў БССР (1917–1937 гг.) / В. П. Антанішын [і інш.] ; рэдкал. тома: І. Я. Марчанка [і інш.]. –1973. – 696 с.

5. Грамовіч, У. У. Інстытут беларускай культуры / У. У. Грамовіч // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1969–1975. – Т. 5. – 1972. – С. 110.

6. Грамовіч, У. У. Інстытут беларускай культуры / У. У. Грамовіч, У.М. Міхнюк, І.У. Саламевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1996–2004. – Т. 7. – 1998. – С. 226.

7. Жылуновіч, З. Нацыянал-дэмократы за "працай" (1920–1928 гг.) / З. Жылуновіч // Спадчына. – 1991. – № 4. – С. 85–96.

8. Институт белорусской культуры [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://ru.wikipedia.org/wiki/Институт_белорусской_культуры. – Дата доступу: 20.12.2011.

9. Институт белорусской культуры и становление науки в Беларуси: к 90-летию создания Института белорусской культуры : материалы Междунар. науч. конф., Минск, 8–9 дек. 2011 г. / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Белорус. наука, 2012. – 769 с.

10. Ігнатоўскі, У. Ад Беларускай Тэрмінолегічнай Камісіі да Беларускай Акадэміі Навук / У. Ігнатоўскі // Наш край. – 1928. – № 12. – С. 6–17.

11. Ігнатоўскі, У. Старонка з гісторыі культурнага будаўніцтва ў БССР / У. Ігнатоўскі // Бальшавік Беларусі. – 1928. – № 12. – С. 10–27.

12. Інстытут беларускай культуры / М. П. Касцюк [і інш.] ; рэдкал.: М. А. Барысевіч [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 255 с.

13. Інстытут беларускай культуры [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://be.wikipedia.org/wiki/Інстытут_беларускай_культуры. – Дата доступу: 04.02.2012.

14. Калистратова, Т. И. Институт истории ФОН МГУ–РАНИОН (1921–1929) / Т. И. Калистратова. – Н. Новгород, 1992. – 216 с.

15. Каранеўскі, І. Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт) / І. Каранеўскі // Наш край. – 1927. – № 10. – С. 16–20.

16. Михнюк, В. Н. Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919–1941 гг.) / В. Н. Михнюк ; под ред. П. Т. Петрикова. – Минск : Наука и техника, 1985. – 286 с.

17. Міхнюк, У. Інстытут беларускай культуры / У. Міхнюк // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1993–2003. – Т. 3. – 1996. – С. 490–491.

18. Міхнюк, У. М. Інстытут беларускай культуры / У. М. Міхнюк // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1979. – № 1. – С. 21–30.

19. Мяснікоў, А. Ф. Сто асоб беларускай гісторыі: гістарычныя партрэты / А. Ф. Мяснікоў. – 2-е выд., дапрац. – Мінск : Літ. і мастацтва, 2009. – 344 с.

20. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 100. Приказы и отчёты о работе Наркомпроса БССР и подведомственных ему учреждений. 19 сентября 1921 г. – 29 ноября 1922 г.

21. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 130. Отчёты о работе инспекториата научных учреждений Наркомпроса БССР. 1 января – 30 декабря 1922 г.

22. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 516. Протоколы заседаний коллегии научно-литературной коллегии Наркомпроса БССР и доклад о работе научной секции академического центра БССР. 17 декабря 1921 г. – 30 декабря 1922 г.

23. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 519. Отчёт о работе за 1921 г., смета расходов на 1922 г. и штатное расписание академического центра БССР, отчёты о работе научно-литературного отдела Наркомпроса БССР, Белорусского государственного академического театра и оперно-драматической студии в гор. Москве. 31 августа 1921 г. – 12 января 1922 г.

24. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 1088. Списки сотрудников учреждений, организаций, предприятий и преподавательского состава учебных заведений БССР. Май 1923 г.

25. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / рэдкал.: М. П. Касцюк [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1994–1995. – Ч. 2. – 1995. – 560 с.

26. Няміга, Г. Інстытут беларускай культуры – Беларуская Акадэмія навук – Акадэмія навук Беларускай ССР / Г. Няміга. – Мюнхен, 1957. – 162 с.

27. Палуян, У. А. Інстытут беларускай культуры і станаўленне беларускай савецкай навукі / У. А. Палуян // Вес. АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1972. – № 6. – С. 104–111.

28. Петрыкаў, П. Ц. Інстытуту беларускай культуры – 70 гадоў / П. Ц. Петрыкаў // Вес. Акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 1992. – № 5–6. – С. 52–70.

29. Пічэта, У. І. Савецкая ўлада і пытаньне аб адчыненьні унівэрсытэту на Беларусі / У. І. Пічэта // Пытаньне аб вышэйшай школе на Беларусі ў мінулым. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – С. 36–48.

30. Постановление Президиума ЦИК Советов Белоруссии об открытии в Минске Белорусского государственного университета // Школа и культура Советской Белоруссии. – 1921. – № 1–2. – С. 114–116.

31. С. Н. Інстытут Беларускай Культуры / С. Н. // Адраджэньне. – 1922. – Сш. I. – С. 278–282.

32. Токараў, М. Вывучэнне культуры і гісторыі яўрэяў у Беларускай акадэміі навук / М. Токараў // Беларусіка = Albaruthenica. – Мінск, 1995. – Кн. 4. – С. 133–136.

33. Центральное еврейское бюро // Вестн. Нар. комиссариата просвещения ССРБ. – 1921. – № 1. – С. 44–45.